# ПЕРАЕМНАСЦЬ ТРАДЫЦЫЙ У РАЗВІЦЦІ БЕЛАРУСКАГА КНІГАЗНАЎСТВА

500-годдзе беларускага кнігадрукавання шырока адзначалася ў нашай краіне, а таксама ўсёй еўрапейскай навуковай супольнасцю і прынесла шматлікія разнастайныя вынікі ў спасціжэнні кніжнай спадчыны Францыска Скарыны, слыннага вучонага і аднаго з найлепшых прадстаўнікоў айчыннай нацыянальнай і сусветнай культуры.

У прадмове да факсімільнага выдання «Бібліі» Ф. Скарыны ў трох тамах (1990) Алесь Пётрашкевіч пісаў, што ў «пашырэнні навук, адукаванасці, засваенні разумнай "житейской мудрости" Скарына бачыў шлях да ўдасканалення чалавека і яго жыцця, справядлівай перабудовы грамадства, "абы научившся мудрости", людзі "добре [жили] на свете". Менавіта гэтай мэце служыць у Скарыны сама Біблія, якую ён тлумачыў як твор асветніцкі, прызваны ўзбагаціць розум чалавека карыснымі для жыцця ведамі, "где научение седми наук вызволеных достаточное". Філосаф, гуманіст і патрыёт, ён усё жыццё і дзейнасць свядома прысвяціў "розмножению мудрости, умения, опатренности, розуму и науки", не шкадуючы сіл, "всякого тружания и скарбов для посполитого доброго и для отчины своея". Глыбока ўсведамляючы веліч навукі, каштоўнасць ведаў, іх перавагу над багаццямі і тытуламі зямных уладароў, Скарына… імкнуўся "оставите в науце и в книгах вечную славу и память свою"».

У 2017 г. кніжная спадчына Францыска Скарыны дзякуючы ўнікальнаму факсімільнаму праекту па ўзнаўленні не толькі «Бібліі» (1517–1519), але і «Малой падарожнай кніжкі» (каля 1522) і «Апостала» (1525), ажыццёўленаму Нацыянальнай бібліятэкай Беларусі ў 20 тамах, стала

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

больш даступнай і вядомай у краіне і за яе межамі. З удзячнасцю Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў прыняў гэты каштоўны дар ад Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі.

Безумоўна, рэалізацыя такога грандыёзнага праекта, як «Кніжная спадчына Францыска Скарыны», рыхтавалася не толькі ў межах распрацаванага НББ праекта па стварэнні электроннай бібліятэкі «Францыск Скарына – беларускі і ўсходнеславянскі першадрукар» адпаведна Дзяржаўнай праграме «Культура Беларусі», але і ў працяг традыцый, закладзеных папярэднікамі. Тут трэба ўзгадаць святкаванні 400-годдзя беларускага кнігадрукавання, што рыхтавалася і шырока адзначалася ў 1925–1926 гг., а таксама 450-годдзя – у 1967 г., 500-годдзя з дня нараджэння Ф. Скарыны ў 1990 г. Гэта знамянальныя падзеі ў беларускай культуры, а таксама і важкія падставы ў развіцці навуковых даследаванняў у галіне кніжнай культуры.

У Беларускім дзяржаўным універсітэце культуры і мастацтваў даследаванне кніжнай культуры было звязана з вывучэннем філасофіі культуры, з імёнамі прафесараў, дактароў філасофскіх навук І. М. Крукоўскага і М. А. Мажэйка, а таксама са станаўленнем ва ўніверсітэце навуковай школы ў галіне педагогікі па бібліятэказнаўстве, бібліяграфазнаўстве і кнігазнаўстве, заснавальнікам якой стаў прафесар, доктар педагагічных навук В. Е. Лявончыкаў, аўтар вядомых падыходаў да распрацоўкі паняццяў «беларуская кніга» і «нацыянальны дакумент». Дзякуючы адкрыццю аспірантуры, дактарантуры, магістратуры былі абаронены дысертацыйныя працы, асаблівая ўвага ў якіх звярталася на распрацоўку педагагічных аспектаў, звязаных з выкарыстаннем кнігі, інфармацыі, інфармацыйных рэсурсаў у развіцці асобы, выхаванні і навучанні.

У другой палове 1990-х гг. кіраўніцтва БДУКМ выказала вялікую зацікаўленасць і спрыяла падтрымцы мерапрыемстваў, накіраваных на адраджэнне нацыянальнай духоўнай культуры. На базе ўніверсітэта праводзіліся шматлікія канферэнцыі. Сярод іх – міжнародная навукова-практычная

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

канферэнцыя «Недзяржаўная выдавецкая дзейнасць у Беларусі: гісторыя і сучаснасць», якая атрымала шырокі рэзананс у сродках масавай інфармацыі. «Упершыню на абсягах былога СССР абмяркоўвалася пытанне недзяржаўнай выдавецкай дзейнасці і яе ўзаемадзеяння з бібліятэкамі рэспублікі» (ЛіМ. 1996. 11 кастр.). З 1997 г. БДУКМ стаў выконваць важную місію па арганізацыі штогадовых Міжнародных Кірыла-Мяфодзіеўскіх чытанняў, прысвечаных Дням славянскага пісьменства і культуры. Увага да вытокаў духоўнасці садзейнічала развіццю даследаванняў рэлігійнай кнігі. У 2005 г. выйшла манаграфія Т. А. Самайлюк «Православная книга в Беларуси».

Актуалізавана праблема захавання, вывучэння і прамоцыі гістарычнай кніжнай спадчыны ў кантэксце сучаснай беларускай сядзібнай культуры. Прыкметнай з’явай сталі міжнародная навукова-практычная канферэнцыя «Універсітэты Ельскіх», прысвечаная 165-годдзю з дня нараджэння Аляксандра Ельскага, і выхад зборніка «Дзеля блізкіх і прышласці» (1999), адзначаныя як «пачатак новай традыцыі» (Культура. 1999. 9–15 кастр. С. 5).

У 2005 г. у БДУКМ распачаты спецыяльны кірунак даследавання ў галіне кнігазнаўства – кніжная культура. На 2006–2010 гг. зацверджана навукова-даследчая тэма «Кніжная культура Беларусі: гісторыка-тэарэтычны аспект» (кіраўнік Л. І. Доўнар). У 2011–2015 гг. на кафедры тэорыі і гісторыі інфармацыйна-дакументных камунікацый распрацоўвалася тэма «Кніжная, бібліятэчная і бібліяграфічная справа ў сістэме бесперапыннай адукацыі Беларусі».

На пачатку 2006 г. у цесным супрацоўніцтве з Міністэрствам культуры, Беларускім фондам фундаментальных даследаванняў і пасольствамі замежных краін была праведзена міжнародная навукова-практычная канферэнцыя пад назвай «Беларуская кніга ў кантэксце сусветнай кніжнай культуры». Яе вынікі знайшлі адлюстраванне ў аднайменным зборніку навуковых артыкулаў. Да сёння выйшла шэсць выпускаў зборніка. Кожны з іх прэзентуе матэрыялы чарговых, праведзеных у БДУКМ, міжнародных навуковых



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

мерапрыемстваў, прысвечаных кніжнай культуры. У шэрагу мерапрыемстваў з удзелам замежных спецыялістаў – праведзены ў 2007 г. да 490-годдзя беларускага кнігадрукавання міжнародны навукова-практычны семінар «Кнігазнаўчыя даследаванні ў Беларусі і Польшчы: вопыт, арганізацыя, перспектывы»; у 2011 г. – «Інфармацыйнае грамадства і бібліятэкі», «Кніга як фактар культуры і прадмет навуковых даследаванняў: гістарычная і сучасная перспектыва»; у 2012 г. – «Рэстаўрацыя і захаванасць кніжных помнікаў: погляд прафесіяналаў»; у 2014 г. – «Актуальныя праблемы бібліятэказнаўства, бібліяграфазнаўства і кнігазнаўства».

Грунтоўныя навукова-практычныя распрацоўкі тэарэтычных і гістарычных пытанняў кніжнай культуры здзейснены прафесарам Л. І. Доўнар, а таксама з яе ўдзелам у калектыўных навуковых працах*.

2017-ы год – Год навукі і святкавання 500-годдзя беларускага кнігадрукавання мы пачалі з правядзення 24 лютага 2017 г. міжнароднага круглага стала «Навуковая кнігазнаўчая школа: пераемнасць, кірункі фарміравання і ўзаемадзеяння», які завяршыўся выпускам публікацый, прадстаўленых у дадзеным выданні чарговага, сёмага зборніка. У ім знайшлі адлюстраванне гуманістычныя, асветніцкія погляды Ф. Скарыны, яго стаўленне да кнігі. Гэта сведчанне здабыткаў навукі пра кнігу, гісторыю яе развіцця.

Захоўваць нацыянальнае пісьменства, кніжную культуру, адначасова забяспечваць шырокі доступ да яе, у тым ліку для навуковага вывучэння, – адна з галоўных задач нашага ўніверсітэта.

Развіццё ўзаемадзеяння ў галіне кніжнай культуры з'яўляецца часткай культурнай палітыкі кожнай цывілізаванай краіны. Кніга разглядаецца як універсальны камуніка-

* Вучэбны дапаможнік «Гісторыя беларускай кнігі», 2012; манаграфія «Кніжная справа ў Мінску (XVIII – пачатак XX ст.)», 2015; калектыўныя манаграфіі: «Кніжнасць новай Беларусі (XIX–XXI стст.)» (пад рэдакцыяй доктара філалагічных навук М. В. Нікалаева), 2011; «Антология мудрости народа: 500 лет белорусского книгопечатания», «500 гадоў беларускага кнігадрукавання», «Книжная культура в контексте инновационного развития общества», 2017.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

тыўны інструмент у сусветнай культурнай прасторы, а ва ўмовах шматкультурнага асяроддзя становіцца важнейшым цэнтрам духоўнай лучнасці прадстаўнікоў розных культур і сацыяльных груп.

Паспяховае міжнароднае ўзаемадзеянне, у тым ліку па перакладзе на беларускую мову і ўвядзенні ў кантэкст беларускай навукі шэрагу арыгінальных навуковых артыкулаў, пацвярджае і выдадзены БДУКМ зборнік навуковых прац «Беларуская кніга ў кантэксце сусветнай кніжнай культуры». У складзе аўтараў, рэдактараў і рэцэнзентаў знакамітыя беларускія і замежныя кнігазнаўцы (прафесары К. МіганЬ, М. В. Нікалаеў, Д. Каўнас, Г. І. Кавальчук, А. І. Груша), якім мы вельмі ўдзячны за спрыянне і падтрымку ў фарміраванні адкрытых актыўных культурных зносін, дыялогу, а значыць, шляхоў устойлівага і перспектыўнага развіцця кніжнай культуры.

***А. А. Корбут,***
*рэктар Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ